ПАДЗЕЯ

# НА СТАРОНКІ – З СЭРЦАЎ ЛЮДСКІХ

**АСТРАВЕЦ. У «горадзе беларускіх атамшчыкаў», як сёння называюць Астравец, у раённай газеце «Астравецкая праўда» шмат гадоў працуе наша калега па пісьменніцкай арганізацыі, публіцыст, празаік, вядомы журналіст Ніна Рыбік. 29 мая ў рамках святкавання 85-годдзя газеты ў райцэнтры прэзентавалі кнігу Ніны Аляксееўны.**

Кніга «Праз гады і газетныя старонкі» прысвячаецца юбілею раённай газеты, расказвае пра розныя этапы яе багатай на падзеі гісторыі і, вядома, пра людзей, якія прысвяцілі сябе служэнню друкаванаму слову, журналістаў Астравецкага краю і пазаштатных карэспандэнтаў перыядычнага выдання. Дарэчы, кніга Ніны Аляксееўны Рыбік з такой жа назвай ужо выходзіла ў 2022 годзе да 80-гадовага юбілею газеты. Таму выданне ў пэўным сэнсе таксама можна назваць перыядычным. Абедзве кнігі члена Беларускага саюза журналістаў і Саюза пісьменнікаў Беларусі Ніны Аляксееўны Рыбік складаюць дылогію, свайго роду летапіс гісторыі, культурнага і грамадскага жыцця Астравеччыны ў двух тамах. Першая частка ахоплівае перыяд з 1941 па 1991 гады, другая – перыяд незалежнай Беларусі.

На свята друкаванага слова ў залу шматфункцыянальнага культурнага комплексу горада Астраўца сабраўся ўвесь калектыў рэдакцыі, сябры і калегі пісьменніцы-журналіста, прыйшлі прадстаўнікі ўлады, ветэраны працы і, канешне, чытачы. У ліку ганаровых гасцей урачыстага мерапрыемства – старшыня раённага Савета дэпутатаў і старшыня раённай арганізацыі Беларускай партыі «Белая Русь» Генадзь Бычко; намеснік старшыні Астравецкага райвыканкама Вольга Баяровіч; галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Зоя Целеш; старшыня Гродзенскай абласной прафсаюзнай арганізацыі работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Дзяніс Малевіч; старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага саюза журналістаў Тамара Рудак. Павіншаваць Ніну Аляксееўну з выхадам новай кнігі, а калектыў рэдакцыі з юбілеем газеты завіталі і сябры-пісьменнікі, члены СПБ – паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык і паэт Анатоль Апанасевіч (з Гродна); публіцыст, краязнаўца Галіна Антонава (Смаргонь).

Пачалася ўрачыстая дзея з яскравай тэатралізаванай пастаноўкі аднаго з эпізодаў рэдакцыйнага жыцця напярэдадні юбілею. У ролях саміх сябе выступілі журналісты «Астравецкай праўды». Атмасфера мерапрыемства была па-сямейнаму душэўнай. Са сцэны прагучала шмат цёплых слоў віншаванняў і шчырых сяброўскіх пажаданняў, уручаліся кветкі і падарункі. Госці і гаспадары прызнаваліся ў любові да друкаванага слова, да сваіх каранёў, да мірнай стваральнай працы. Гісторыя абодвух друкаваных выданняў – газеты і кнігі пра яе – выканала ролю сімвалічнага люстэрка, з якога на нас пазіраюць дух часу, вобраз народа-працаўніка, грамадзяніна Беларусі, жыхара Астравеччыны. Менавіта гэты вобраз з’яўляецца ключавым, галоўным носьбітам бясцэннай гістарычнай праўды.

Кожны з гасцей свята атрымаў у падарунак асобнік кнігі «Праз гады і газетныя старонкі» (частка 2) з аўтарскім аўтографам Ніны Рыбік. Асноўная ідэя мерапрыемства – вернасць людзей абранай справе, шчасце жыцця дзеля Радзімы і роднага краю – не толькі атрымала ўвасабленне ў прамовах выступоўцаў, але і трапіла з сэрцаў людзей на друкаваныя старонкі.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** на свяце друкаванага слова, прысвечаным 85-годдзю газеты «Астравецкая праўда» і выхаду кнігі Ніны Рыбік «Праз гады і газетныя старонкі» (частка 2). Астравец, 29 мая 2026 года.




АСТРАВЕЦКАЯ
ПРАЎДА


Вялікай Перамогі
Ніна Рыбік
Праз гады і газетныя старонкі
Да 85-годдзя «Астравецкай праўды»


АСТРАВЕЦКАЯ ПРАЎДА
Раённая газета раскажа...
...пра галоўнае, важнае, цікавае!
ВАШАЙ УВАЗЕ:
Наш сайт ostrovets.by
АКТУАЛЬНЫЯ НАВІНЫ краіны, вобласці, раёна, горада;
ЦІКАВЫЯ ПРАЕКТЫ «Карэспандэнт высвятляў», «Новыя астраўчане»,
...і пакажа


БОЛЬШЭВІЦКІ АРГАНІЗАТАР
СТАЛІНСКАЯ ПРАЎДА
СА СВЯТАМ ПЕРАМОГІ, ТАВАРЫШЫ!
АСТРАВЕЦКАЯ ПРАЎДА
1945-1967
80-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца
РАЁННАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
АСТРАВЕЦКАЯ ПРАЎДА
№35 (9360)
ЧАЦВЕР, 8 мая 2025 г.
БЕЛАРУСЬ ПОМНІЦЬ!
Дзякуй за мірнае неба і шчаслівае жыццё!
Раённая газета «Астравецкая праўда»
Героі Вялікай Перамогі
Ніна Рыбік
Праз гады і газетныя старонкі
БОЛЬШЭВІЦКІ АРГАНІЗАТАР
СТАЛІНСКАЯ ПРАЎДА
АСТРАВЕЦКАЯ ПРАЎДА
БЕССМЯРОТНЫ ПОДЗВІГ САВЕЦКАГА НАРОДА



Управление
надёжное звено
■ 8 стр.
Ёсць


Героі
Вялікай Перамогі
Праз гады
і газетныя
старонкі


ПК-
Героі
Праз гады
і газетныя
старонкі
Праз гады
і газетныя
старонкі







Перад мерапрыемствам




Гучыць віншаванне ад ГрАА СПБ




85
гадоў
разам


85